Учитывая всю символичность указанных фигур, их поверхность в ювелирных изделиях заполнялась не менее содержательным орнаментом (геометрическим, растительным, анималистическим, антропоморфным). Последовательность включения орнаментальных мотивов в изделие зависела от распространения христианства (православия). При изучении наследия художественной обработки металлов в Беларуси важно понимать, что более ранним орнаментом был геометрический (универсальные мотивы, солярные знаки). С расширением влияния новой веры (и византийской культуры) получают распространение антропоморфные изображения (святые-мученики, христианские герои, образы Деисуса). Ярусность, возникшая в композиционном решении изделия, позволяла изобразить сложные мотивы и сюжеты, объясняющие представления человека об устройстве мира. Постепенно складывается и система зооморфных образов, особенностью персонажей (грифонов, птиц-дев, драконов) которых является языческая семантика.

Универсальные орнаментальные мотивы славянского язычества и христианства зачастую соединялись внутри композиции одного изделия, что свидетельствует о семантическом единстве, взаимном проникновении смысловых функций из одних мотивов в другие.

Определенное значение в исследовании теоретических основ ювелирного искусства имеют и цветовые предпочтения, и технологические приемы обработки материалов. Несомненно, разнообразные исторические, этнографические, археологические находки дают современному исследователю пищу для размышлений, обеспечивая связь со своим прошлым.

**Список литературы:**


1. Башков, А. А. Предметы христианского культа индивидуального использования конца X – XIV вв. на территории Беларуси: классификация, топография, хронология : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.06 / А. А. Башков ; НАН Беларуси, Ин-т истории. – Минск, 2000. – 19 с.
2. Беларусы : [у 12 т.] / НАН Беларусі, ІМЭФ. – Мінск : Беларус. навука, 1995 – 2009. – Т. 8 : Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва / [Я. М. Сахута]. – 2005. – 351 с.
3. Зоценко, В. Н. Об одном типе древнерусских энколпионов / В. Н. Зоценко // Древности Среднего Поднепровья : сб. науч. тр. / Акад. наук УССР, Ин-т археологии; [отв. ред. И. И. Артеменко]. – Киев, 1981. – С. 113 – 124.
4. Корзухина, Г. Ф. Древнерусские энколпионы: нагрудные кресты-реликварии XI – XIII вв. / Г. Ф. Корзухина, А. А. Пескова. – СПб. : Петерб. востоковедение, 2003. – 427 с.
5. Наркевіч, Н. І. Ювелірнае мастацтва Беларусі XII – XVIII стст. : аўтарэф. дыс. ... канд. мастацтвазн. : 17.00.04 / Н. І. Наркевіч. – Мінск : ДНУ «Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы» НАН РБ, 2011. – 24 с.



*Алена Пагоцкая*


**ДЭКАРАЦЫЙНАЕ АФАРМЛЕННЕ БАТЛЕЕЧНАГА ТЭАТРА**


*Гістарычнае станаўленне тэатра батлейка было звязана з заходнееўрапейскай культурай і мастацтвам. Канструкцыйныя асаблівасці батлейкі на тэрыторыі Беларусі сфарміраваліся пад уплывам царкоўнага і народнага тэатраў. Асноўныя элементы афармлення батлейкі – форма, дэкарацыі, лялькі – узнікалі і існавалі паралельна з развіццём беларускага тэатральнага мастацтва к. XVI – пач. XX стст.*



*Alena Pagotskaya*


**DECORATIVE DESIGN OF BATLEYKA THEATRE**


*Historical formation of Batleyka theater was associated with culture and art of Western Europe. Structural features of Batleyka in Belarus were formed under the influence of church and folk theater. Key design elements Batleyka – shape, decoration, dolls – emerged and existed in parallel with the development of the Belarusian theater in the late 16th – early 20th centuries.*


Адзін са старажытных відаў беларускага мастацтва і найбольш папулярных відаў сцэнічнай творчасці ўсходніх славян – беларускі народны тэатр «батлейка». У Беларусі гэты від тэатра атрымаў распаўсюджанне з XVI ст. пад уплывам заходнееўрапейскага мастацтва. Канструкцыйным правобразам батлейкі была панарама-скрыня невялікага памеру з нерухомымі лялькамі [2, с. 98]. Да ўзнікнення тэатра батлеечнага тыпу ў Заходняй Еўропе ў XV ст. прывяло аб’яднанне панарамы з прынцыпам «ажыўлення» лялек.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Для лялечнага беларускага тэатра характэрны тыя ж элементы, што і для заходнееўрапейскага тэатра эпохі Сярэднявечча. Па-першае, гэта праяўляецца ў афармленні, бо для рэпертуару батлейкі былі ўласцівы сярэдневяковыя містэрыі. Па-другое, характэрнай асаблівасцю рэпертуару батлейкі было тое, што ён падзяляўся на «высокі» жанр – рэлігійная тэматыка – і «нізкі» – сатырычныя сцэнкі з народнага жыцця. У адпаведнасці з гэтым будавалася канструкцыйная аснова батлейкі – падзел скрыні на «неба» і «зямлю»: «рай» знаходзіўся з левага боку верхняга яруса, а «пекла» з правага боку ніжняга. «Пекла» часта паказваецца ў выглядзе галавы д’ябла ці дзвярэй з правага боку ў ніжнім ярусе.

Гістарычнае развіццё беларускай батлейкі знаходзіцца ў пэўнай сувязі з польскім лялечным тэатрам шопка. У часы Сярэднявечча манахі-францысканцы прынеслі з Італіі на польскія землі традыцыю выстаўлення ў касцёле падчас Раства невялікіх фігурак Хрыста, Марыі, Іосіфа, пастухоў, авечак, быкоў. Гэта група герояў, якая прадстаўляла Раство Хрыстова, і атрымала назву яселка[13].

У афармленні лялечных тэатраў, якія знаходзіліся пад уплывам царквы, існуе сувязь з пэўнай канфесіяй. Напрыклад, польская шопка арганізавана па вобразе каталіцкіх касцёлаў і манастыроў, з багатым упрыгожаннем царкоўных рэчаў, а ў батлейцы праяўляецца строгасць і стылізацыя рыс праваслаўнай царквы.

У Беларусі бытавала некалькі відаў батлеечнага тэатра. Гісторык тэатра даследчык М. Каладзінскі называе пяць асноўных тыпаў батлейкі: аднапавярховая, двухпавярховая, трохпавярховая, ценевая і збудаваная па прынцыпе тэатра марыянетак [2, с. 99]. Тэатразнаўцы Г. Барышаў і А. Саннікаў налічваюць шэсць яго асноўных відаў [1; 2].

У рэпертуары **аднапавярховай (панарамнай)** батлейкі пераважалі містэрыяльныя сюжэты, звязаныя з нараджэннем Хрыста і пакланеннем вешчуноў. Па сваёй канструкцыі яна нагадвала жыллё беларускага селяніна. Пярэдняя яе сценка была з палатна, якое апускалася і падымалася, як заслона ў тэатры.

**Двухпавярховыя з рухомымі лялькамі** прадстаўлялі сабой вялікую, больш за два метры, скрыню з двух паверхаў. Канструкцыя гэтай скрыні нагадвала царкву, якая мела ад аднаго да трох купалаў. Верхні ярус – «неба» – сімвалізуе месца, дзе нарадзіўся Ісус, тут адбываліся сцэны на біблейскія тэмы. У цэнтры верхняга яруса размяшчалася ніша з яслямі, дзе знаходзіўся Ісус. Ніжні ярус, так званая «зямля», уяўляў сабой палац цара Ірада, дзе дэманстраваліся сцэны бытавога характару. Афармляўся гэты ярус сціпла, проста, багаты роспіс, які быў характэрны для «неба», адсутнічаў. На ніжнім ярусе былі дзверы, трон цара Ірада і драўляная галава д’ябла, якая знаходзілася над уваходам у пекла.

**Двухпавярховыя з вежай** батлейкі былі распаўсюджаны на Міншчыне ў канцы XIX ст. Такая батлейка мела круглую, квадратную ці шасцівугольную вежу, дзе знаходзіліся дзверы. У цэнтры па вертыкалі рухаўся стол, зроблены ў выглядзе дыска, па краях яго былі фігуркі жанчын і мужчын, якія трымаліся за рукі. Самы яркі прыклад такой батлейкі – Ельнінскі вяртэп XVIII – пач. XIX ст.

**Батлейкі па прынцыпе ценевага тэатра** аб’ядноўвалі рысы панарамнай батлейкі і ценевага тэатра, яны мела выгляд трохкупальнай царквы. Сцены такой батлейкі былі з прамасленай паперы. Унутры купала размяшчаліся металічныя кольцы з фігурамі герояў, якія ўдзельнічалі ў спектаклі, і свечка. Батлеечнік адчыняў дзверы, запальваў свечку і круціў кольцы адпаведна дзеяннем спектакля.

У канцы XIX – пачатку XX стст. на тэрыторыі Беларусі былі распаўсюджаны **батлейкі з празрыстымі дэкарацыямі**, якія змяняліся падчас спектакля. Тэатр такога тыпу быў у Патупчыка – батлеечніка з Докшыц. Гэта двухпавярховая скрыня з двума аддзеламі, якая нагадвала хату з двухсхільным дахам, абклееным сіняй паперай з сярэбранымі месяцам і зоркамі. У верхняй частцы скрыні знаходзіліся два пеўні, бойка якіх пачынала прадстаўленне. Другі аддзел, дзе знаходзіліся лялькі, вырабляўся са шкла, абклейваўся тонкай паперай. Празрыстыя дэкарацыі маляваліся на папяроснай паперы і прымацоўваліся па баках скрыні. У адтуліны, дзе гарэлі свечкі, уверсе ўстаўляліся вузкія люстэркі, яны падавалі і рэгулявалі святло. Па краях скрыня ўпрыгожвалася ружовай паперай, нарэзанай махрамі. У цэнтры даху знаходзіўся драўляны крыж.

Апісанне **батлейкі-«зоркі»** знаходзім у матэрыялах Г. Барышава. Ён спасылаецца на этнаграфічныя запісы Ю.Ф. Крачкоўскага «Быт западнорусского селянина». Гэты від батлейкі ўяўляе сабой зорку, якую з песнямі насілі калядоўшчыкі. Раму ад рэшата ці сіта абклейвалі прамасленай паперай і прымацоўвалі да жэрдкі, каб было лягчэй пераносіць з аднаго месца на другое. На зорку з чатырох ці шасці канцоў прымацоўваліся рознакаляровыя пірамідальныя «рогі». Затым мацавалі да кія другое невялікае кола, па акружнасці якога наклейвалі выразаных з паперы салдацікаў на конях ці пяхоту. У рамку зоркі ўстаўлялася свечка (у памяшканні не павінна было быць святла), і кола з фігуркамі пачынала рухацца [3, с. 439].

На тэрыторыі Беларусі самай распаўсюджанай была двух’ярусная батлейка з простымі дэкарацыямі. Сустракаліся батлейкі, якія нагадвалі царкву. Але ў большасці выпадкаў батлейкі былі падобныя на шафу з дзвярыма ў выглядзе хаткі ці царквы з дахам, на якім быў купал з крыжам. Батлейка змяшчала гарызантальныя ярусы сцэны, кожны з якіх меў прастору для ваджэння лялек.

Афармленню батлейкі надавалася вялікае значэнне. З даўніх часоў захаваліся яго характэрныя рысы. Батлейка ўпрыгожвалася каляровай паперай, геаметрычнымі фігурамі з саломы, паперы, разьбой і вышыўкай. Сама батлеечная скрыня выраблялася з фанеры і драўляных рэек. Перакладзіна ўстаўлялася ў адпаведныя адтуліны бакавых рам. Яна служыла для ўмацавання шырмы з матэрыялу. Затым ўстаўляліся паліцы, якія

[13] Яселка была асновай для развіцця шопак. Яселка (ад польскага слова Jaselka – кармушка, яслі) адносіцца да XIII – XV стст. і вядзе пачатак ад касцёльных містэрый, якія ў XIII ст. распаўсюдзіліся ў Еўропе.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

служылі ніжнім і верхнім ярусамі. На ніжняй паліцы можна было асобна ладзіць лялечныя спектаклі, вадзіць марыянетак і іншых лялек. Да пярэдняй рамы часта прымацоўваліся спецыяльныя рамкі для ценевага тэатра і лялечнай эстрады. У ніжнім ярусе тэатра была спецыяльная скрыня для лялек.

На верхнім ярусе двух’яруснай батлейкі паказвалі біблейскія сцэны, звязаныя з нараджэннем Хрыста. Упрыгожанне гэтага яруса было багатым, з элементамі царкоўнай атрыбутыкі. На задніх сценках размяшчаліся абразы, зоркі, крыжы і кампазіцыі на біблейскую тэматыку. У цэнтры знаходзілася высокая, абклееная «залатой» паперай арка, у глыбіні якой быў алтар. Па баках рабіліся дзве меншыя аркі, якія служылі для ўваходу і выхаду лялек. Столь абсыпалася зоркамі, для гэтага здрабнялася каляровае шкло і люстэрка. Ніжні ярус афармляўся як палац цара Ірада, у ім праходзілі бытавыя сцэны.

З канца XIX – пачатку XX стст. адным з папулярных відаў мастацтва і сцэнічнай творчасці Беларусі была народная драма. Гэта адбілася на рэпертуары батлейкі. На яго паўплывалі руская народная драма і раёк. У сваю чаргу батлейка ўздзейнічала на фарміраванне рускага вяртэпнага тэатра.

Такім чынам, батлейка з часу яе ўзнікнення і на працягу ўсяго свайго развіцця і існавання аказала істотны ўплыў на фарміраванне лялечнага тэатра, а таксама на беларускую драматургію і культуру. Вывучэнне асаблівасцей батлейкі дае магчымасць вызначыць яе спецыфіку, паказаць тэрыторыю бытавання гэтага тэатра. Традыцыі батлеечнага тэатра выкарыстоўваюцца і сёння ў прафесійным сцэнічным і дэкаратыўна-прыкладным мастацтве: у пастаноўках лялечных спектакляў, дэкаратыўным афармленні саломкай ці вышыўкай, а таксама ў аднаўленні прадстаўленняў батлейкі, якая набывае ўсё большую папулярнасць.

**Спіс літаратуры:**


1. Барышаў, Г.І. Батлейка / Г.І. Барышаў. – Мінск: Бел. універсітэт культуры, 2000. – 270 с.
2. Гісторыя беларускага тэатра: у 3-х т. / АН БССР, ІМЭіФ. – Мінск: Навука і тэхніка, 1983. – Т.І. Беларускі тэатр ад вытокаў да Кастрычніка 1917 г. – 496 с.
3. Тэатральная Беларусь: энцыклапедыя: у 2 т. / Рэдкал.: Г.П.Пашкоў [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 2002. – 568 с.: іл.



***Юлия Николаева***


## ФОЛЬКЛОРНАЯ ОБРАЗНОСТЬ КАК ХУДОЖЕСТВЕННЫЙ ПРИНЦИП ЭСТРАДНО-ЦИРКОВОГО ИСКУССТВА


*В статье рассматривается народная сказка как носитель принципа художественной образности, который выражается в действенной основе повествования. Доказывается, что именно эта основа и отражает суть некоторых эстрадно-цирковых жанров и объединяет их со сказкой в единое эстетическое образование.*



***Julia Nikolaeva***


## FOLK IMAGERY AS THE MAIN PRINCIPLE OF VARIETY-CIRCUS ART


*The article discusses the folk tale as a carrier of the artistic imagery principle, which is expressed in the efficient manner of narration. It is being proved that this is the basis and reflects the essence of some variety-circus genres and combines them with the tale into a single aesthetic education.*


Основной функцией фольклора как словесного народного творчества является передача из поколения в поколение жизненного опыта, «житейской» мудрости. Пройдя через этап обряда, породившего предания, трудовые и обрядовые песни, мифологические рассказы, заговоры, словесное народное творчество завершило мифологический этап, перейдя в разряд собственно фольклора, важнейшим этапом формирования которого стало появление сказки, где сюжеты осознавались как вымысел. Сказка, исполняемая публично, приобретала оттенки площадного искусства скоморохов (в Европе – гистрионов) и весьма органично соединилась с мастерством певцов, танцоров, акробатов, мимов, жонглёров, скоморохов, фокусников: слово визуализировалось через эстрадное действие и цирковой трюк. И этот симбиоз не случаен: на заре культуры человечества, на этапе обряда, в народном творчестве преобладал синкретизм, характеризующийся нерасчленённостью на жанры. Даже спустя тысячелетия выделившиеся жанры генетически стремятся к соединению.

Есть и другая причина стремления фольклора и эстрадно-цирковых жанров к единству: именно сказка стала наиболее ярким фольклорным проявлением – носителем художественного принципа фольклорной образности, который определяется в выражении жизненного опыта исключительно через лаконичные, внутренне выразительные действия, они и являются сутью эстрадно-циркового искусства. Народная сказка далека от философских размышлений о смысле жизни и психологических характеристик героев, она является прежде всего цепочкой взаимосвязанных и взаимообусловленных действий. Чрезвычайная конкретность, наглядность, предметность сказок свидетельствует о том, что они рождались в жизненном обиходе простого



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ